**Стаднюк, Т.** Творцы / Т. Стаднюк // Родныя вытокі (Докшыцы). – 2007. – 15 верас. – С. 3.

## ТВОРЦЫ

Наш невялікі старажытны гарадок стаў радзімай адораных Богам творцаў у самых розных галінах мастацтва. Докшыцы – гэта калыска вядомых беларускіх мастакоў Маркаўцоў. Віктар Маркавец напісаў звыш 200 карцін, якія набылі вядомасць на радзіме і ў замежжы. Знакавым творам сярод іх можна назваць карціну «Свята ў Докшыцах». Творы мастака знаходзяцца ў многіх мастацкіх музеях Беларусі, Расіі, Польшчы.

Не менш таленавітыя і яго сёстры Валянціна Маркавец–Бартлава і Галіна Крываблоцкая. Валянціна Пятроўна працуе ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (габелен), а таксама ў галіне распрацоўкі і мадэліравання трыкатажных вырабаў, сцэнічных касцюмаў. Яна ўдзельніца многіх выстаў, член Беларускага саюза мастакоў, загадчык кафедры Беларускай акадэміі мастацтваў, дацэнт. Мае шэраг узнагарод за заслугі ў выяўленчым мастацтве. Галіна Пятроўна скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе выкладчыкам Беларускага каледжа мастацтваў. Як і сястра, яна дасягнула значных вяршынь у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Вядомы яе міні-габелены, рэпрэзентатыўныя мастацка-вобразныя кампазіцыі, выкананыя ў розных тэхніках і матэрыялах. Творы мастачкі таксама знаходзяцца ў многіх музеях Беларусі, Украіны, Польшчы, прыватных калекцыях ЗША, Індыі, Германіі.

Дакшычане беражліва захоўваюць памяць аб сваім таленавітым земляку Сяргею Вішнеўскім. Творчая спадчына гэтага майстра багатая і разнастайная. Ён аўтар партрэтаў сям'і паноў Слатвінскіх, якія паспрыялі таму, каб таленавіты хлопец з беднай сям'і стаў студэнтам мастацкай вучэльні ў Вільні. У сталым узросце Сяргей Антонавіч захапіўся напісаннем краявідаў і нацюрмортаў. Спрабаваў сябе ў маляванні царкоўных абразоў. Пакінуў вялікую мастацкую спадчыну ў фотатворчасці. У 50-я гады ў Докшыцах ён арганізаваў фотамайстэрню і трымаў яе на вельмі сур'ёзным мастацкім узроўні. Ужо ў наш час намаганнямі Віктара Маркаўца ў Мінску ў галерэі фальварка «Добрыя думкі» была арганізавана выстава жывапісу і фотамастацтва нашага земляка.

Свой талент Сяргей Вішнеўскі перадаў сыну Аляксандру. Прафесійны мастак Аляксандр Сяргеевіч Вішнеўскі працуе ў Доме рамёстваў. Ён піша карціны, а некалькі год таму вырашыў паспрабаваць сябе ў кераміцы, дзе дасягнуў поспеху і прызнання. А. С. Вішнеўскі з'яўляецца лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва «Кругазварот-1998», удзельнікам і дыпламантам рэспубліканскага свята «Ганчарны круг» на працягу некалькіх год.

У Доме рамёстваў працуе шмат людзей, прагных да мастацтва. Таксама прафесійны мастак Іван Плыгаўка зараз спецыялізуецца на разьбе па дрэве. Разныя пано, драўляная скульптура, у прыватнасці, драўляныя механічныя цацкі – гэта тыя рэчы, дзе ў поўнай меры праявіўся талент творцы. Іван Парфір'евіч з'яўляецца лаўрэатам 1-га Рэспубліканскага свята-конкурсу разьбярства «Дрэва жыцця», лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва «Кругазварот-1988».

3-пад рук апантанага майстра сваёй справы Наталлі Пятровіч выходзяць сапраўдныя цуды ткацтва. Нездарма, у 2003 годзе яна стала членам рэспубліканскага Саюза майстроў народнай творчасці.

Майстэрства лозапляцення Таццяны Гавардовай і Алега Войніча адзначаны сёлета першай і трэцяй прэміямі на «Славянскім базары ў Віцебску».

Індывідуальнасць і прафесіяналізм характэрны для работ Таццяны Махніст. Яна стала лаўрэатам 2-й прэміі на 1-м Рэспубліканскім свяце-конкурсе саломапляцення «Саламяны цуд» і была ўзнагароджана Ганаровай граматай за выкананне саламянай скульптурнай кампазіцыі «Купальская лялечка».

На Брэстчыне плённа працуе яшчэ адзін мастак з Докшыц – Ігар Абуховіч. Гэта родны брат Таццяны Яўгенаўны. Яго карціны экспанаваліся на выставах у Віцебску, Брэсце, Германіі. Ён быў аўтарам ілюстрацый да серыі кніг беларускага пісьменніка А. Бернардскага.

***Т. Стаднюк***